УДК 069.5:94

## Музейная экспазіцыя як інтэрпрэтацыйная мадэль гістарычнай рэчаіснасці

**Гаўрылава С. В.**
*Нацыянальны Полацкі гісторыка-культурны музей-запаведнік, Полацк*

*Артыкул прысвечаны разгляду асаблівасцей музейнай экспазіцыі на аснове яе здольнасці выступаць у якасці прасторава-часавай мадэлі гістарычнай рэчаіснасці. Мінулае існуе ў свядомасці людзей у выглядзе ўяўленняў пра яго, у сучаснасці мінулае прадстаўлена "асколкамі" – прадметамі, якія музей выяўляе, збірае, захоўвае і прэзентуе. Музейны прадмет, які з'яўляецца асновай экспазіцыі музея, у кантэксце дадзенага даследавання прыняты як згорнутая мадэль рэчаіснасці. Менавіта экспанаты ўтвараюць прадметна-прасторавую структуру экспазіцыі. Працэс інтэрпрэтацыі музейных прадметаў – гэта галоўны мадэлюючы механізм, які дэтэрмінуе напаўненне гэтай прасторы сэнсамі і фарміраванне яе часавай арганізацыі. Здольнасць прадметаў рэпрэзентаваць не толькі факты, з'явы і падзеі гісторыі, але і прадстаўляць цэлыя эпохі, робіць музейны час не аддзельным ад прасторы. Музейнае мадэляванне мае некалькі ўзроўняў і грунтуецца на музейнай інтэрпрэтацыі аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Пры розным спалучэнні тых ці іншых аспектаў як унутранага, так і знешняга інфармацыйнага поля прадметаў могуць быць атрыманы розныя, часам супрацьлеглыя мадэлі. Адэкватнае ўспрыняцце наведвальнікам прэзентаванай музеем мадэлі рэчаіснасці і генерыраванне ўласнай мадэлі залежыць ад шэрага аб'ектыўных і суб'ектыўных фактараў.*

*Праведзенае даследаванне дазволіла сфармуляваць аўтарскую дэфініцыю паняцця "музейная экспазіцыя".*

***Ключавыя словы:*** *музейны прадмет, музейная экспазіцыя, музейнае мадэляванне, гістарычная рэальнасць, інтэрпрэтацыя музейная.*

## Museum Exposition as an Interpretation Model of Historical Reality

**Haurylava Slavina Vjachaslavauna**
*Polotsk National Historical and Cultural Museum-Reserve, Polotsk*

*The article considers the peculiarities of the museum exposition in terms of its ability to act as a spatio-temporal model of historical reality. In people's minds the past exists in the form of its representation; in the present the past is presented by the «fragments» – the objects that the museum uncovers, collects, preserves and presents. In the context of this study museum object, which is the foundation of the museum, is regarded as a concise model of reality.*

*It is the exhibit that constitutes the subject-dimensional structure of the exposition. The process of interpretation of museum objects is the main modeling mechanism that determines the semantic content of this space and its temporal organization. The objects property to represent not only the facts, phenomena and events in history but whole epochs, makes the museum time inseparable from museum space.*

*Museum modeling has several levels and is based on the museum's interpretation of historical and cultural heritage. When various combinations of different aspects of both internal and external information fields of the objects are taken into account, models obtained can be contradictory sometimes. Visitors' adequate perception of the model of reality presented by the museum and his or her self-generated model depends on a number of objective and subjective factors.*

*This study has allowed the author to formulate own definition of the concept of «museum exposition».*
***Key words:*** *museum object, museum exhibition, museum modeling, historical reality, museum interpretation*